Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

№ 31 (422)

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Субота 22 кастрычніка 1960 г.

Цана 10 кап.

РАБОТНІКІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ, ЗА ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС! ДАБІВАЙЦЕСЯ ХУТЧЭЙШАГА УКАРАНЕННЯ Ў ВЫТВОРЧАСЦЬ НОВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ І ДАСЛЕДАВАННЯЎ! РЫХТУЙЦЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВАРТЫХ ЭПОХІ КАМУНІЗМА!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 43-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі)

## КАМУНІСТЫЧНЫ СВЕТАПОГЛЯД—МАСАМ

У перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства ўсваенне камуністычнага светапогляду, авалодванне асновамі марксізма-ленінізма, глыбокае разуменне палітыкі партыі становяцца жыццёвай неабходнасцю для кожнага савецкага чалавека. У рашэннях XX і XXI з'ездаў КПСС, у пастанове Цэнтральнага Камітэта партыі «Аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах» распрацавана канкрэтная праграма далейшага пад'ёму ў нашай краіне ўсёй ідэалагічнай работы, адпавядаючай задачам сучаснасці.

Адным з важнейшых сродкаў узбраення савецкіх людзей марксісцка-ленінскім светапоглядам з'яўляецца сістэма партыйна-палітычнай асветы. 1 кастрычніка ў сетцы партасветы пачаўся новы навучальны год.

Адбыліся першыя заняткі ў 27 тэарэтычных семінарах і гуртках, створаных сёлета пры партыйнай арганізацыі універсітэта. Кіруючыся рашэннямі партыі і дырэктывамі вышэйстаячых партыйных органаў, пярвічныя партарганізацыі і партком правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да новага навучальнага года. У чэрвені месяцы былі старанна прааналізаваны вынікі мінулага навучальнага года ў сетцы партасветы універсітэта. Партком адзначыў высокі навуковы і ідэйны ўзровень, добрую арганізаванасць у рабоце тэарэтычных семінараў, якімі кіравалі тт. В. І. Сцяпанаў, А. В. Кірсанаў, Д. Б. Мельцар, гурткоў пад кіраўніцтвам А. В. Самускевіча, Н. В. Пархімовіч і некаторых іншых. Разам з тым партыйны камітэт выявіў рад недахопаў, якія мелі месца ў рабоце некаторых гурткоў і семінараў, галоўным чынам арганізацыйнага характару (зрывы заняткаў у семінарах філфака, хімфака, гуртку адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў) і арыентаваў пярвічныя партарганізацыі на рашучую барацьбу з падобнымі недахопамі.

Камплектуючы сетку партасветы ў новым навучальным годзе, партыйныя арганізацыі поўнасцю ўлічвалі цікавасць і жаданне таварышаў пры выбары форм і профілю палітычнай вучобы. Усе навуковыя работнікі ў бягучым годзе працуюць самастойна над авалодваннем марксісцка-ленінскай тэорыяй з абмеркаваннем вынікаў работы ў тэарэтычных семінарах. Створаны тры новых філасофскіх тэарэтычных семінары—для выкладчыкаў кафедр замежных моў (кіраўнік дацэнт А. С. Лакіза), для навуковых работнікаў вылічальнага цэнтра (кіраўнік кандыдат філасофскіх навук т. Кляўчэня) і для асістэнтаў і лабарантаў фізічнага і хімічнага факультэтаў (кіраўнік дацэнт т. Гусеў). Удакладнілі свой профіль у бок набліжэння да непасрэднай спецыяльнасці раней працаваўшыя семінары. Ва ўсіх адзінаццаці тэарэтычных семінарах адбыліся арганізацыйныя сходы. Вызначана тэматыка, раздадзены першыя даклады. Задача партыйных бюро пярвічных партарганізацый—у бліжэйшыя дні зацвердзіць на сваіх пасяджэннях тэматыку семінараў, праграмы гурткоў і ўзяць іх работу пад неаслабны кантроль. Важна з першых заняткаў дабіцца не толькі добрай арганізаванасці, але і высокага ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню семінараў, творчага абмеркакавання вывучаемых праблем.

У сёлетнім навучальным годзе ў нас пачалі работу два новых гурткі павышанага тыпу па вывучэнню навуковай біяграфіі У. І. Леніна (для работнікаў бібліятэкі і друкарні і выдавецтва), а таксама працягваюць работу ранейшыя філасофскія і эканамічныя гурткі. Значна павялічыўся лік гурткоў бягучай палітыкі—іх цяпер працуе 10 замест 6 ў мінулым годзе. Падабраны і зацверджаны вопытныя, падрыхтаваныя прапагандысты з ліку выкладчыкаў і аспірантаў кафедр грамадскіх навук. Вельмі важна арганізаваць работу гэтых гурткоў так, каб захапіць слухачоў, уцягнуць іх у актыўнае абмеркаванне надзённых пытанняў бягучай палітыкі. Пярвічныя партыйныя арганізацыі, асабліва адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і друкарні і выдавецтва, павінны пастаянна цікавіцца работай гурткоў, ідэйным зместам праводзімых заняткаў, аказваючы паўсядзённую дапамогу прапагандыстам.

У цяперашні час рознымі формамі партыйна-палітычнай работы ў нашым універсітэце ахоплена каля 490 чалавек з ліку прафесарска-выкладчыцкага, дапаможнага і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу. Неабходна так арганізаваць работу ўсіх звенняў сістэмы партыйна-палітычнай вучобы нашай партыйнай арганізацыі, каб усе члены нашага калектыву сістэматычна і глыбока займаліся авалодваннем марксісцка-ленінскай тэорыяй.



Ізаляваць сэрца лягушкі не так проста. Гэта таксама свайго роду аперацыя, якую патрэбна ўмела правесці.

НА ЗДЫМКУ: студэнт IV курса біялагічнага факультэта Сяргей Бортнік ускрывае лягушку для ізаляцыі сэрца і запісу яго работы на кілографе.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

## Першы універсітэцкі

Усё больш і больш студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта прысвячаюць свой адпачынак турызму—самаму актыўнаму з відаў адпачынку, самаму захапляючаму з відаў спорту.

9 кастрычніка цішыню нядзельнага дня ў інтэрнаце матэматыкаў парушыла звонкая песня. Гэта больш 50 удзельнікаў першага універсітэцкага злёту турыстаў і альпіністаў вярнуліся дамоў. Разнастайнай была праграма злёту. Вечарам ля кастра больш 4 гадзін кіраўнікі сямі паходаў секцыі расказвалі аб уражаннях лета. Раніцой быў дадзен старт удзельнікам спаборніцтваў на першынство універсітэта па закрытаму маршруту. Чэмпіёнамі сталі Ала Куловіч і Саша Люцко—трэцякурснікі фізфака.

З вялікай цікавасцю ўдзельнікі злёту сачылі за турысцкай эстафетай. І хоць імжэў дождж, агульную ўвагу прыцягнуў «Дамбайскі бокс»,—традыцыйны альпінісцкі жарт.

На першую пасля 9 кастрычніка трэніроўку секцыі турыстаў-альпіністаў прышло многа навічкоў. Гэта адзін з вынікаў злёту.

Цяпер члены секцыі рыхтуюцца да рэспубліканскага злёту турыстаў і альпіністаў.

М. НЕМЕНМАН.

Насустрач Міжнароднаму Дню студэнтаў

## НА МОВЕ ДРУЖБЫ

Стаяў цудоўны восеньскі дзень. Я праходзіў каля стадыёна «Дынама». Тут маю ўвагу прыцягнулі аўтобусы «Інтурыста». Я зацікавіўся, падыйшоў да групы людзей, якія стаялі ля ўваходу на стадыён.

Пачуўшы іх размову, зразумеў, што гэта нашы госці з Германіі. Я рашыў пазнаёміцца з імі, а разам з тым праверыць, ці ведаю я нямецкую мову.

Перш за ўсё: да каго падыйсці? Тут я ўбачыў юнака ў форме сельскагаспадарчага рабочага. Падыйшоў, прывітаўся. Пазнаёміліся. Яго завуць Гейнц Вірман. Ён сапраўды працуе ў РТС пад Берлінам. Але калі я пачаў дапытвацца, у якасці каго ён працуе, мы доўга не маглі зразумець адзін другога, пакуль на дапамогу не падыйшоў яго сябра Курт Лазэр, студэнт 5 курса гістарычнага факультэта Берлінскага універсітэта імя Гумбальдта. Ён часта бывае экскурсаводам, калі ў Берлін прыязджаюць госці з Савецкага Саюза. Курт двойчы бываў у Чэхаславакіі, адзін раз—у Венгрыі. Нашу краіну наведаў упершыню.

Ён зацікавіўся, у чым мы не можам адзін другога зразумець. А потым ўсе трое рассмяяліся. Чаму? Гейнц тлумачыў мне, што ён вадзіцель аўто. Я пачаў пералічваць: грузавік... таксі... легкавая... Усе не тое. І толькі пры дапамозе Курта мы выявілі, што Гейнц—трактарыст.

Курт паведаміў, што яны прыехалі чарговым поездам дружбы з ГДР. Праз паўтары гадзіны яны накіруюцца далей, у Ленінград, а потым у Маскву. З дазволу кіраўніка дэлегацыі мы пайшлі гуляць па Мінску. Перад гэтым нашы госці пабывалі на плошчы Перамогі, у доміку-музеі I з'езду партыі, у мастацкім музеі. Я рашыў паказаць маім нямецкім сябрам будоўлю новага корпуса універсітэта, расказаў аб рэканструкцыі плошчы імя Леніна.

Цікава, як мы вялі размову. Яны мне гаварылі па-нямецку, а я ім—па руску. Прычым Курт перакладаў Гейнцу мае словы на нямецкую мову. І ўсё ж мы разумелі адзін другога, бо наша мова была мовай дружбы.

Як заўсёды, студэнтаў цікавіць жыццё іншых ВНУ. Мы расказалі адзін другому аб сваіх універсітэтах, пацікавіліся аб стыпендыях, інтэрнатах.

Ішлі мінуты. Мы размаўлялі аб кнігах, газетах, кіно і нават аб мужчынскіх модах. Гейнца, як заядлага курыльшчыка, зацікавілі нашы сігарэты, асабліва «Беларускія араматызаваныя».

Паглядзелі на гадзіннік. Ужо пара ісці да цягніка. Ля вакзала ўжо збіраліся члены дэлегацыі. Курт і Гейнц рашылі пазнаёміць мяне са сваімі сяброўкамі. Іх завуць Луіза Фібігер і Астрыд Шмідт. Яны працуюць на радыё ў Берліне. А паміж калегамі заўсёды знойдзецца тэма для размовы—яны ж таксама журналісты.

Мы абмяняліся адрасамі, паштоўкамі. Рабяты атрымалі ад мяне паштоўкі з відамі Мінска, а дзяўчаты—з кветкамі. А мне яны пакінулі на памяць паштоўкі з відамі Берліна.

Утраіх дапамаглі Астрыд і Луізе падняцца ў вагон. Развітваючыся, мы пацiскалі моцна рукі да таго часу, пакуль поезд не крануў з месца.

І пакуль за паваротам не знік поезд, чатыры рукі дружна махалі мне на развітанне.

Я. ЛЯХАЎ.

## „А БЫЛО Ж, ГА?.."

*...З гораччу вымаўляе гэтыя словы адзін з герояў п'есы «Дванаццатая гадзіна» Арбузава. Але мы не збіраемся ў гэтай заметцы разглядаць той або іншы спектакль. Мы вымушаны гаварыць аб іншым, аб тым становішчы, якое склалася ў нашым тэатральным калектыве ў цяперашні час. І вось тут мы вымушаны салідарызавацца з гэтым «было». Імена, было!*

*...Былі «На дне», «Дзеці сонца», «Кола шчасця», былі выдатныя так званыя «Капуснікі», якія па сіле абагульнення далёка выходзілі за рамкі нашага універстэта, былі і іншыя спектаклі, якія прыносілі тэатральнаму калектыву нязменны поспех, была, нарэшце, і «Дванаццатая гадзіна». І вось тут нам здаецца, што з «Дванаццатай гадзінай» прабіла і апошняя гадзіна нашага калектыву. Іронія лёсу!*

*Можна многа гаварыць аб розных прычынах. Але мы не станем гэтага рабіць. Хочацца верыць у велізарныя магчымасці нашага універсітэта. Вось яны — гэтыя магчымасці — трохтысячны кантынгент студэнтаў. Нарэшце, у наступным навучальным годзе мы атрымаем цудоўную актавую залу. Як пасля гэтага не дуць на тлеючы вугалёк! Ніяк нельга параўнаць нашы магчымасці з тымі, што маюць іншыя студэнцкія тэатральныя калектывы. А там жа кіпела і кіпіць работа!*

*Многіх жадаючых займацца ў тэатральным калектыве можа палохае чыста аматарскі характар нашай работы. Але яны памыляюцца на гэты конт. Ён аматарскі ў лепшым сэнсе гэтага слова. І вельмі не хацелася б яшчэ раз паўтараць старую ісціну. Шлях на прафесіянальную сцэну вядзе іменна праз такое аматарства. Факты? Калі ласка. Дабралюбаў, Маленчанка і іншыя, ўжо вядомыя ў рэспубліцы артысты — гэта выхаванцы нашага тэатральнага калектыву.*

*Мы звяртаемся да нашых студэнтаў і асабліва малодшых курсаў — вы павінны прыйсці, убачыць і перамагчы! А дагэтуль было так: прыйшоў, убачыў і пайшоў. Вы павінны змагацца за свой тэатральны калектыў!*

*С. ФРЫДМАН,*
*студэнт 3-га курса фізфака.*

## Лекцыі чытаюць журналісты

*Плённа працавалі студэнты аддзялення журналістыкі на сельскагаспадарчых работах у калгасах Дзяржынскага раёна. У прадстаўленых характарыстыках на групы студэнтаў другога, трэцяга і чацвёртага курсаў кіраўнікі сельгасарцелей «Кастрычніцкая рэвалюцыя» і «Беларусь» дзякуюць калектыў груп за добрасумленную працу.*

*Апрача гэтага, студэнты вялі вялікую палітыка-выхаваўчую работу. Трэцякурснікі прачыталі сем лекцый і правялі шаснаццаць гутарак з калгаснікамі арцелі «Кастрычніцкая рэвалюцыя». З цікавасцю праслухалі хлебаробы лекцыі на тэмы: «Аб культуры паводзін», «Аб міжнародным становішчы СССР», «Аб маральным аблічча савецкага маладога чалавека», гутаркі «Афрыка рве путы», «Місія міру і дружбы М. С. Хрушчова ў ААН» і іншыя. Добрымі прапагандыстамі зарэкамендавалі сябе студэнты Л. Макарэнка, І. Патапаў, А. Казявін, Д. Бяспалы, З. Шарамецьеў і У. Бабкоў.*

*У першай паляводчай брыгадзе далі канцэрт мастацкай самадзейнасці для калгаснікаў.*

*Другакурснікі У. Панёў, М. Казакевіч, А. Кукевіч, Т. Харавец у той жа арцелі правялі адзінаццаць гутарак з сельскімі працаўнікамі, арганізавалі сумесны вечар калгаснай і студэнцкай моладзі і выпусцілі два нумары насценнай газеты «За высокі ўраджай».*

*Студэнты чацвёртага курса У. Паўлаў, Р. Струц і М. Шоба ў чацвёртай паляводчай брыгадзе калгаса «Беларусь» выпусцілі насценгазету «Студэнт», дзе адлюстравалі працоўныя поспехі студэнтаў і калгаснікаў.*

*— Цікавы народ гэтыя студэнты, — гаворыць брыгадзір чацвёртай брыгады калгаса «Беларусь» Піліп Радзіч, — і працуюць добра і адпачываюць весела. Прыязджайце да нас на наступны год, сустрэнем па-сяброўску, — дадаў ён на развітанне.*

*В. КАВАЛЬКОЎ,*
*сакратар партгрупы аддзялення журналістыкі.*



Вялікую цікавасць у студэнтаў нашага універсітэта выклікае спецыяльна абсталяваны ў хімічным корпусе стэнд-карта бягучых падзей.

На здымку: студэнты знаёмяцца з картай бягучых падзей.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.




Не, не. Я зусім не збіраюся пісаць аб вядомым вам фільме «Неадпраўленае пісьмо». Хоць размова тут таксама будзе ісці аб пісьмах і таксама — неадпраўленых. Трапілі яны да мяне зусім выпадкова. Я іх уважліва прачытаў і рашыў, што некаторыя з іх дастойны вашай увагі, дарагія чытачы. Дык вось, не буду выпрабоўваць ваша цярпенне.

Чытайце!

# Неадпраўленыя пісьмы

*ПІСЬМО I.*

*12 верасня.*

*Жануля!!! Палымянае сельскагаспадарчае прывітанне, Лёс-злодзей закінуў мяне ў вёску Ярылаўка Дзяржынскага раёна. От, назвачка! Прыдзецца працаваць. Бачу, Жанусік, як ты ўсміхаешся. Ты, як ніхто іншы, разумееш, што паняцці «я» і «працаваць» узаемна выключаюць адзін другога. Але калі трэба, дык трэба. Пастараюся не перагружацца.*

*Ку-ку, гудбай, спяшаюся за малаком.*

*Твой Верык*

*ПІСЬМО II*

*13 верасня.*

*Жанулька, добры дзень!*

*Толькі што з работы. Ну мы і папрацавалі. Мы — гэта я і сяброўка. Яе прозвішча Емяльянава. З ёю я, што называецца «спрацавалася». Уяўляеш, сядзіць яна на адной баразне і напявае: «дзе б ні працаваць, абы не працаваць», а я нацягваю другую пару пальчатак і дапаўняю яе каштоўную думку: «А калі і працаваць, то не прыкладаючы рук». Суцэльная хохма!*

*Ну, будзь здаровенька. Сама разумееш, што па закону Архімеда пасля смачнага абеду трэба... адпачыць. Цалую.*

*P. S. Дарэчы, шамоўка добрая: 300 грамаў мяса, літр малака і бульбы хоць заваліся. Жалеза!*

*Верык.*

*ПІСЬМО III.*

*26 верасня.*

*Прывітанне маёй Жанульцы!*

*Вось ужо некалькі дзён штурмую бульбяныя барозны адна. Сяброўка мая, Емельянава, ірванула недзе даведку на тры дні і адбыла ў Смаленск. Праўда, прайшло ўжо значна больш трох дзён, а яе няма. Гуляе! Малайчына! А даведачку дастане. Гэта для яе не праблема.*

*Ну, і дзянёк быў сёння. Прыехалі мы ўсе з выхаднога. Панядзелак — дзень цяжкі. Спім, значыць, сапім сабе. І тут, уяўляеш, гаспадар, у якога мы на кватэры, старая порхаўка, скрыпіць:*

*— У колькі вас разбудзіць?*

*Пахіхікалі мы. А я яму з печы такім гарэзным галаском цікаўлюся:*

*— Мужычок, мужычок, чаго трэба?*

*Заціх ён. Мы далей храпака задалі яшчэ гадзіны на дзве, пакуль нас выкладчыца Соф'я Аляксееўна не падняла. Ну, пайшла, пакапалася крыху... Ведаеш, маё выказванне: «Працаваць, няхай трактар працуе, ён жалезны».*

*Ну, бывай. Цалую. Верык.*

*ПІСЬМО IV.*

*3 кастрычніка.*

*Жануся, здарова!*

*Прыехала, нарэшце, мая сяброўка, Ух, мы з ёй і «працусм». Каласальна! Нават спяваем задорна:*

*Нам ў калгасе добра жыць:*
*Адзін робіць—сем ляжыць.*
*А як сонца прыпячэ*
*Дык і сёмы ўцячэ.*

*А ўчора мы з сяброўкай свой жа рэкорд гультайства пабілі. Дзве барaзны нявыбранай бульбы пакінулі. І яна, уяўляеш, замерзла. Дык тут той-сёй шыпеў, бульбы ім, ці бачыш, мала. Плябеі. Такія вось справы. Ну, цалую цябе.*

*Твой Верык.*

*ПІСЬМО V.*

*4 кастрычніка.*

*Прывітанне з Мінска!*

*Дык мы, я і Емяльянава, ужо тут. Дзянёк сэканомілі. Трэба ж нам адпачыць пасля такой напружанай працы. А група наша яшчэ там. Капаюцца чувачкі ў зямлі.*

*Ну, пакуль. Спяшаюся. Раблю рэйд па паліклініках. Да зарэзу патрэбны даведкі!!!*

*Цалую. Верык.*

*ПІСЬМО VI.*

*7 кастрычніка.*

*Здаецца, нам моцна ўляціць. Чуе маё сэрца, Жанік, вылезе нам гэтая бульба бокам. Спадзяюся толькі на даведкі. Гэта мой адзіны шчыт супраць стрэл і коп'яў так званай грамадскасці.*

*Маліся за мяне, маліся.*

*Гудбай, коцік. Цалую цябе.*

*Верык.*

Прачыталі? Ну вось і добра. Але я зусім забыўся назваць аўтара «неадпраўленых пісем». Іх напісала студэнтка III курса рускага аддзялення Вера Маркава. Што? Не пісала. Значыць, толькі з-за гультайства. А ўсё аб чым тут сказана — праўда. Ужо ў гэтым пакладзіцеся на маю сумленнасць.

Даніла ШЫЛА.

## Табе, першакурснік, раіць Даніла Шыла



Якая падрыхтоўка,



...такі і вынік на экзамене.

# Гісторыкі ўперадзе



Адзін з забегаў студэнтаў нашага універсітэта.



Аня Лаўруковіч.

Нельга сказаць, што ў гэты дзень надвор'е спрыяла спаборніцтвам. Наадварот, густы цяжкі туман нехаця раставаў, асядаў, таяў, пакідаючы пасля сябе золак наступаючай асенняй раніцы.

Неўзабаве туман амаль знік, і толькі кроплі расы на яшчэ неапаўшых лісцях дрэў напаміналі аб яго нядаўнім існаванні.

11 гадзін раніцы. Ажыў парк імя Чэлюскінцаў, які дагэтуль стаяў у якімсьці асеннім здрантвенні. Сотні юнакоў і дзяўчат з нашага універсітэта прыбылі сюды, каб традыцыйным асеннім кросам, прысвечаным 43-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, закрыць свой летні спартыўны сезон. Дарэчы, гэта ж было і першае спартыўнае мерапрыемства, якое ўваходзіла ў залік чарговай дзявятай круглагадовай універсітэцкай спартакіяды.

Першымі стартуюць дзяўчаты матэматычнага факультэта. За імі біёлагі, географы, юрысты, гісторыкі... Сярод дзяўчат асабістае першынство ў бегу на 800 метраў заваявала студэнтка гістарычнага факультэта Аня Лаўруковіч. Яе вынік — 2 мін. 49,8 сек. не ўдалося перакрыць нікому. Толькі Ірына Капашова наблізілася да пераможцы. Час студэнткі фізічнага факультэта ўсяго на 3,2 сек. горшы. Трэцяе і чацвёртае месца падзялілі паміж сабой студэнткі матэматычнага факультэта Надзя Субач і Надзя Жураўлёва.

Найлепшы вынік сярод юнакоў у бегу на 1.500 метраў паказаў студэнт гістарычнага факультэта Мікалай Базылеў. Ён пераадолеў гэтую дыстанцыю за 4 мін. 14,8 сек. 8,2 сек. прайграў яму студэнт філалагічнага факультэта Мікалай Гаўручэнка, які выйшаў на другое месца. На трэцім — гісторык Яўген Кухарэнка.

Гісторыкі заваявалі , агульнакамандпае першае месца. Спартсмены фізічнага і матэматычнага факультэтаў занялі адпаведна другое і трэцяе месца.

На апошніх месцах, як заўжды, філолагі і юрысты. Самы нізкі працэнт масавасці паказаў юрыдычны факультэт. На крос з'явілася толькі 47 працэнтаў яго студэнтаў.

Нізкія спартыўныя вынікі паказалі хімікі. У нарматывы ўкладліся толькі 83 чалавекі з 207 студэнтаў хімфака, якія прынялі ўдзел у кросе.

Трэба сказаць, што арганізацыя спаборніцтваў жадае быць лепшай. Многія ўдзельнікі кросу вымушаны былі чакаць свайго забегу да трох гадзін дня. Многія стаміліся і не змаглі паказаць добрых вынікаў. І ўжо зусім недаравальна тое, што кафедра фізвыхавання дапусціла да ўдзелу ў кросе студэнтаў без адпаведнага медыцынскага абследавання.

В. АНЦЫФЕРАЎ,
А. ШРУБОК.
Фота В. АНЦЫФЕРАВА.



Мікалай Базылеў

# На змену Чанею...

Амерыканскага артыста Лона Чанея называлі чалавекам, які мае тысячу твараў. Ніна Філіпаўна Федзюкова, наколькі мне, гэта значыць, Даніле Шыле, вядома, пакуль што не збіраецца стаць галівудскай кіназоркай. І ўсё ж лаўры Лона Чанея не даюць ёй спакою. Нядаўна Ніне Філіпаўне ўдалося даказаць, што яе з поўнай падставай можна назваць чалавекам хаця б з двума тварамі. Адзін твар у Ніны Філіпаўны ў аўдыторыях тэатральнага інстытута, дзе яна выкладае студэнтам асновы марксіцкай эстэтыкі, другі—у 70 пакоі інтэрната па вуліцы Свярдлова, дзе яна пражывае са згоды адміністрацыі універсітэта разам з лабаранткай хімфака Ірынай Міхайлаўнай Яхніч. Пакой дзяўчат шырокі, прасторны. Хоць у футбол гуляй, хоць рок-энд-рол скачы. Паспрабавалі да іх падсяліць трэцюю жыхарку, аспірантку першага года навучання Галіну Мартыновіч. Ды дзе там! Ніна Філіпаўна на дыбкі стала. Такой лаянкай абліла дзяўчыну, што тая не ведала, куды дзявацца. Шчоўкнула ключом перад носам—і ўсё тут. Ведай, маўляў, нашых!

Радуйся цень Чанея, змена расце.



# ФОТА абвінавачвае



Такі выгляд мае пакой № 12 інтэрната па вуліцы Свярдлова...

## Песня Лепешава,

### СТУДЭНТА З ГЕАФАКА

*Музыка Т. Болдзінай*
*Словы У. Паўлава*

Мне на сілас ісці не ахвота,
Я падумаю трохі яшчэ.
Бо не воўк жа, урэшце, работа—
У лес не ўцячэ.

**Прыпеў:**

Сонца ў небе коціцца
За гарой.
Ой, рабіць не хочацца,
Ой-ё-ёй!

Ну, а лён няхай дурні цягаюць,—
Многа пылу на гэтым ільну.
Лепш пайду на салому да гаю
Ды і там увільну.

**Прыпеў:**

Сонца ў небе коціцца
За гарой.
Ой, рабіць не хочацца,
Ой-ё-ёй.

(З газеты «Студэнт», выпушчанай географамі і журналістамі ў калгасе «Беларусь» Дзяржынскага раёна).

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 00490. Зак. 1825. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000.